да ведама

# На мове гарадскога фэнтэзі

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася сустрэча з дзіцячай пісьменніцай з Самары Вікторыяй Ледэрман, аўтаркай кніг для школьнікаў «Каляндар майя», «Да дошкі пойдзе Васількін», «Першакурсніца», «Тэорыяневерагоднасці» і іншых.**

Пісьменніца, якая працуе ў жанры гарадскога фэнтэзі, падзялілася ўражаннямі свайго дзяцінства, юначымі захапленнямі. Вікторыя Ледэрман нарадзілася на Волзе, у 2001 годзе скончыла філалагічны факультэт Самарскага дзяржаўнага сацыяльна-педагагічнага ўніверсітэта і выкладала французскую і англійскую мову ў школе.

У 2014 годзе прыняла ўдзел у літаратурным конкурсе з аповесцю «Каляндар майя», атрымала Міжнародную дзіцячую прэмію імя У. П. Крапівіна, а пазней і прэмію імя Карнея Чукоўскага.

Літаратар супрацоўнічае з выдавецтвам «КомпасГід», дзе выходзяць яе кнігі. Адзін з яе твораў быў экранізаваны, здымкі праходзілі ў Санкт-Пецярбургу.

Сюжэты і героі яе аповесцей не выдуманыя, а ўзятыя з жыцця і школьных назіранняў, таму блізкія сучасным юным чытачам.

**Эла ДЗВІНСКАЯ**